Некалі суцішалі жазлом
неспакойныя хвалі,
Але чым мне суцішыць
у сэрцы тугу?
Ерыхонскія сцены ад трубаў
грымучых упалі.
А я песняй разбурыць ніяк не магу
Сцен маўчання, якія цябе
сцерагуць.

(М.Танк)
*Т.Ф.Рослік.*

**АДНАЎЛЕ́ННЕ** спектакля, пастаноўка п'есы, якая ішла ў тэатры шмат гадоў назад і доўгі час не ставілася. Можа мець мэтай рэстаўрацыю — паказ п'есы ў традыц. ранейшым выкананні і афармленні. Такое А. патрабуе звычайна параўнальна невял. колькасці рэпетыцый і асобнай дапрацоўкі і абнаўлення некаторых частак дэкарацый (напр., А. спектакля «Брама неўміручасці» К.Крапівы ў Бел. тэатры імя Я.Купалы, паст. 1974, адноўлены ў 1983). Капітальнае А. найчасцей патрабуе не толькі рэстаўрацыі, але і значнага абнаўлення ранейшага старога спектакля, увядзення новых выканаўцаў. Пры гэтым можа быць зменена трактоўка вобразаў, зроблена спец. афармленне. Так былі адноўлены ў Бел. тэатры імя Я.Купалы спектаклі «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы (паст. 1939, А. 1964), «Машачка» А.Афінагенава (паст. 1941, А. 1952), «Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра (паст. 1946, А. 1951, 1955), у Бел. тэатры імя Я.Коласа — «Гамлет» У.Шэкспіра (паст. 1946, А. 1955), у Нац. акадэмічным Вял. тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь — «Марная засцярога» П.Л.Гертэля (паст. 1938, А. 1959, 1979, 2003, 2009), у Нац. акадэмічным драм. тэатры імя М.Горкага — «Адзіны наследнік» Ж.Ф.Рэньяра (паст. 1974, А. 2002) і інш.

**АДО́НАК**, 1) памост для складвання неабмалочаных снапоў з мэтай захоўвання збажыны ад вільгаці. Будавалі з 4 слупоў (ступіц) выш. ад 0,4 да 0,9 м, а ў балоцістых мясцінах да 1,5 м. На слупах мацавалі перакладзіны (аподні), на якія насцілалі дошкі (лубцы). Зверху А. пакрывалі саломай. Снапы складвалі на А. ўкругавую, каласамі на сярэдзіну. 2) Памост з сушняку ці жэрдак, на які кладуць стог сена або скірду збожжа.

**АДРАДЖЭ́ННЕ**, Рэнесанс, гістарычны і культурны перыяд у развіцці еўрап. народаў (14—1-я пал. 17 ст.), пераходны паміж сярэдневякоўем і Новым часам. У эпоху А. ўзнікае прынцыпова новая карціна свету, фарміруюцца новыя прынцыпы ладу жыцця, навук. і маст. творчасці. У мастацтве гэтай эпохі склаўся самаст. стыль — рэнесанс. Культуру А. вылучаюць антрапацэнтрызм, свецкі характар, гуманізм, звяртанне да антычнасці. Творчасць майстроў А. прасякнута верай у моц розуму і волі, бязмежныя магчымасці чалавека, адмаўляла сярэдневяковы аскетызм. Рэнесансная ідэалогія паставіла пад сумненне прынцып саслоўнага раздзялення і патрабавала цаніць чалавека па яго асабістых якасцях і заслугах. Устанаўленне ідэалу дзеючай, творчай асобы, прыгажосці зямной рэчаіснасці, адчуванне цэльнасці і гарманічнасці сусвету прыдаюць мастацтву А. велічны маштаб. Развіццё А. ў асобных краінах і рэгіёнах Еўропы не супадала ў часе, але надала еўрап. культуры пэўнае адзінства. А. ўзнікла і яскрава праявілася ў Італіі ўжо на рубяжы 13—14 ст. Існуе розніца паміж развіццём рэнесанснай культуры ў краінах Паўд. і Паўн. Еўропы. Для паўд.-еўрап. А. характэрна развіццё паэзіі, рыторыкі, сюжэтнага і партрэтнага жывапісу, відовішчнай культуры. Для паўн.-еўрап. А. (Англія, Францыя, германскія княствы) быў уласцівы акцэнт на кнігадрукаванне, тэалогію, логіку, тэарэт. філасофію, публіцыстыку, пейзажны жывапіс і нацюрморт, муз. культуру. Рэнесансная культура ўздзейнічала на ўсе пласты грамадства, абапіралася на розныя грамадскія групы (сярэднія пласты і вярхі гарадоў, частку кліра, прадстаўнікоў арыстакратыі). Станаўленне А. ў ВКЛ (16 — пач. 17 ст.) абумоўлена пазітыўнымі пераменамі ў эканам., сац.-паліт. і культ. жыцці, развіццём гарадоў, актывізацыяй магнацка-шляхецкага руху за рэфармаванне грамадска-дзярж. інстытутаў краіны. У гэты час сфарміравалася высокая культура бел., укр. і літоўскага народаў. На падставе ўспрымання ідэй еўрап. Рэфармацыі развіваліся айчынная інтэлектуальная культура, адукацыя і кнігавыданне. Працягваўся працэс станаўлення бел. літ. мовы, развіваліся гістарыяграфія, філас. і грамадска-паліт. думка, прававая тэорыя, выяўл. мастацтва, архітэктура, музыка, тэатр. Атрымлівае распаўсюджанне мецэнацтва, узнікаюць цэнтры гуманіст. культуры пры магнацкіх дварах (Алелькавічаў, Радзівілаў, Хадкевічаў, Глябовічаў, Астрожскіх і інш.). Пашыраецца захапленне адукаванай часткі грамадства антычнай культурай, арыстакратычная моладзь атрымлівае адукацыю ў зах.-еўрап. ун-тах. А. ў ВКЛ было ў сваім развіцці бліжэй да паўн. А. і мела такія асаблівасці, як злучэнне ўсх.-заходнехрысціянскіх рэліг.-духоўных каштоўнасцей, станаўленне нац. культуры ў поліэтнічным і поліканфесійным грамадстве ва ўмовах адноснай рэліг. талерантнасці (2-я пал. 16 ст.), узаемадзеянне бел., укр., літоўскай, польск. і рус. культур, сувязь рэнесанснага гуманізму з айчыннай Рэфармацыяй, паліт. і нац.-культ. рухамі 16—17 ст. З эпохай А. звязана развіццё айчыннай філас. і грамадска-паліт. думкі. Склаліся асн. канцэпцыі і ідэалы бел. інтэлектуальнай культуры: злучэнне агульначалавечага і нац., гуманіст. персаналісцкая канцэпцыя чалавека, вяршэнства закону, дасягненне грамадскай згоды, талерантнасць і рэліг. плюралізм, этычная дамінанта, развіццё духоўнай культуры на нац. аснове, непрыманне прымусу і насілля. Фундаментальным паняццем з'явілася свабода. Духоўны свет чалавека разумеўся як гарманічны сінтэз боскага і натуральнага. Прагрэс чалавецтва разглядаўся як маральнае і духоўнае аднаўленне чалавека і грамадства (Ф.Скарына, М.Літвін, А.Волан, Ю.Да-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

манеўскі). Асн. праблемай сац.-паліт. і прававой думкі з'явілася ўдасканаленне грамадства і дзяржавы. У эпоху А. фарміруецца паняцце аб правах чалавека (на шчасце, годнае жыццё, прыватную ўласнасць). Геніяльным прадбачаннем стала ідэя Міколы Гусоўскага аб экалагічным выхаванні. У рэнесанснай думцы павялічваецца цікавасць да гісторыі. Ідэя нац. самасвядомасці атрымлівае працяг у творчасці Міколы Гусоўскага, С.Буднага, В.Цяпінскага, Л.Зізанія, І.Пацея і інш.

У літаратуры пачынальнікам гуманіст. А. ў Беларусі быў асветнік і першадрукар Ф.Скарына, які пераклаў на бел. мову і зрабіў каментарый да Бібліі. Друкаваная кніга садзейнічала дэмакратызацыі л-ры, далучэнню да яе простага, «паспалітага», паводле Ф.Скарыны, народа. Першай прыкметай эпохі А. было станаўленне свецкай маст. культуры, у т.л. л-ры і філал. навукі. Перакладзеныя Ф.Скарынам біблейскія кнігі, свабодная інтэрпрэтацыя біблейскай гісторыі садзейнічалі ўдасканаленню старабел. мовы, развіццю яе шматфункцыянальных стыляў — маст., публіцыст., багаслоўскага, стылю юрыд. актаў і гіст. твораў. Рэнесансны кірунак у л-ры арыгінальна выявіўся ў творчасці паслядоўнікаў Ф.Скарыны — В.*Цяпінскага*, С.*Буднага*, у лексіцы Статута ВКЛ у трох рэдакцыях — 1529, 1566 і 1588. Узніклі новыя жанры л-ры — свецкая публіцыстыка, сілабічная паэзія, танічная нар. паэзія, эпічныя і гіст. жанры, палемічны і грамадска-паліт. стылі. На этапе ранняга Рэнесансу высокага маст. ўзроўню дасягнула новалац. паэзія (творчасць Я.*Вісліцкага*, Міколы Гусоўскага). Прадстаўнікі пратэстанцкай л-ры і тэалогіі (С.Будны і яго паслядоўнікі) у 16—17 ст. абгрунтавалі ідэю свабоды літ. творчасці, навук. і багаслоўскай думкі. Традыц. для сярэдневяковай л-ры ананімнасць змянілася акцэнтацыяй свайго аўтарства і праслаўленнем радзімы, эстэтызацыяй і ўзвышэннем роднага краю і роднай мовы (апалогія радзімы і роднай мовы Ф.Скарыны, абарона роднай мовы В.Цяпінскім). На этапе позняга А. (2-я пал. 16 — 1-я пал. 17 ст.) пачалося станаўленне філал. навукі («Грамматіка словенска...» Л.*Зізанія*, «Грамматики словенския правильная синтагма» М.*Сматрыцкага*, дзе ёсць кароткія раздзелы па тэорыі паэзіі). У 1-й пал. 17 ст. пашыралася выкладанне паэтыкі і рыторыкі. Рэнесансная л-ра паўплывала на творчасць *Сімяона Полацкага* і садзейнічала станаўленню бел. нац. А. ў 19—20 ст.

А. ў архітэктуры характарызавалася выкарыстаннем лагічных, прапарцыянальных, суразмерных чалавеку кампазіцый і рашэнняў з імкненнем да адкрытых прасторавых структур на аснове гуманіст. светапогляду. У архітэктуры Беларусі ідэі А. спрыялі развіццю і росту гарадоў, узмацненню буд. цэхавых арг-цый, станаўленню прам-сці буд. матэрыялаў, павелічэнню капітальнасці забудовы, пашырэнню тыпалогіі грамадскіх будынкаў, выпрацоўцы мясц. архіт.-маст. вырашэнняў. Былі выкананы першыя работы па комплекснай рэканструкцыі гарадоў (Быхаў, Нясвіж, Слуцк, Рэчыца). Пры перабудове імкнуліся да стварэння рэгулярнага плана з прамавугольнай сеткай вуліц і геаметрычнай формай плана ў выглядзе авала, паўавала, прамавугольніка. Цэнтрам горада была гандлёвая плошча («рынак») з ратушай і крамамі. Роля замка ў абароне горада змяншалася; часам ён будаваўся на перыферыі гар. забудовы і звязваўся з горадам спец. вуліцай, якая звычайна атрымлівала назву Замкавая (Гродна, Капыль, Навагрудак). Абарончыя ўмацаванні ўдасканальваліся з дапамогай бастыённай сістэмы (Заслаўе Мінскага р-на, Слуцк і інш.). Важнымі акцэнтамі забудовы гарадоў сталі грамадскія будынкі: ратуша, крамы, якія часам аб'ядноўвалі ў гандлёвыя рады, важніцы, аптэкі, лазарэты. У гэты перыяд фарміруецца характэрны для Беларусі тып дома гандляроў і рамеснікаў, у якім з боку гал. фасада рабілі краму ці майстэрню, часам з «падчэнямі», а з двара — жылую частку. У манумент. архітэктуры А. маст. значнасць канструкцыйных гатычных элементаў паступова змяншалася, што дазволіла распрацаваць прыёмы фарміравання багатага, пластычна насычанага дэкору сцен і шчытоў на аснове выразнасці цаглянай кладкі (*Мірскі замкавы комплекс*, *Мураванкаўская царква Раства Багародзіцы*, *Сынкавіцкая царква-крэпасць*), а таксама шчытоў гал. фасада з выкарыстаннем атынкоўкі (*Чарнаўчыцкі Троіцкі касцёл*, *Камайскі касцёл Яна Хрысціцеля*). У культавай архітэктуры атрымалі развіццё зальныя (*Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква*), часам цэнтрычныя структуры (*Смаргонскі кальвінскі збор*), аб'ёмнасць кампазіцыі якіх падкрэслівалася атыкам па ўсіх фасадах. Выкарыстанне больш адкрытых кампазіцый садзейнічала развіццю прасторавых вырашэнняў, пашырэнню ў архітэктуры галерэй і аркад (*Рагачоўскі палац*). Элементы архітэктуры А. таксама прасочваюцца ў ранніх барочных пабудовах — ступеньчаты франтон, дэкар. скляпенняў (*Крамяніцкі Юр'еўскі касцёл*, *Вішнеўскі касцёл святога Тадэвуша*).

У выяўленчым мастацтве эпохі А., асабліва ў яго свецкіх відах, узрастала цікавасць да паказу ўнутранага свету чалавека. Майстрамі засвойваліся адпаведныя часу выяўл. прыёмы і тэхнікі. Большасць твораў станковага і манумент. жывапісу, якім уласціва выкарыстанне поствізант. іканаграфічных канонаў, не захавалася, пра іх вядома па літ. і архіўных крыніцах, адноўленых работах [роспісы Дабравешчанскай царквы ў Супраслі (цяпер у Падляскім ваяв., Польшча), 1557]. Ішоў далейшы працэс фарміравання адметных рыс бел. праваслаўнай іканапіснай школы: абразы ўзбагачаліся жыццёвай пераканаўчасцю ў трактоўцы сюжэтаў, персанажаў, часам уключэннем быт. дэталей, светлым

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

каларытам, арнаментаванымі фонамі («Святая Параскева», Слуцкі р-н, 2-я пал. 16 ст.; «Маці Божая Адзігітрыя Іерусалімская» з Пінскай Варварынскай царквы, «Хрыстос Усеадзяржыцель» з Успенскай царквы в. Быцень Івацэвіцкага р-на, абодва 16 ст.). Развіццё алтарнага іканапісу адбывалася пераважна пад уздзеяннем зах.-еўрап. традыцый, майстры звярталіся да святлоценявых мадэліровак, перспектыўнай перадачы прасторы, пачуццёвых характарыстык персанажаў («Пакланенне вешчуноў» з Браслаўскага р-на, «Святая сям'я са святым Францыскам» з Пінскага касцёла Успення Дзевы Марыі, абодва 16 ст.; алтар-трыпціх «Святая Кацярына. Маці Божая. Святая Дарагэя» з капліцы ў в. Мохавічы Лідскага р-на, пач. 17 ст.). Узмацненне рэнесансных, свецкіх настрояў у мастацтве паўплывала на жывапісны партрэт: парадны з рысамі зах.-еўрап. («Юрый Радзівіл» з Нясвіжскага замка, канец 16 — пач. 17 ст.), нац. («Міхаіл Барысавіч» з Нясвіжскага замка, канец 16 — пач. 17 ст.), сармацкі партрэт. Разнастайнай стала скульптура (круглая пластыка, плоскасная і аб'ёмная разьба іканастасаў, надмагіллі, дробная пластыка і інш.), якая вылучалася больш свабоднай трактоўкай форм, чысцінёй кампазіцыйнай пабудовы, выкарыстаннем ляўкасу, паліхроміі («Святы Грыгорый Багаслоў» з Полацка, пач. 16 ст.; «Маці Божая з дзіцем» з Нясвіжскага касцёла Божага Цела, канец 16 ст.; царская брама з в. Варанілавічы Пружанскага р-на, канец 16 ст.). Рэнесансная эпоха з яе ідэаламі паўплывала на надмагіллі — з выявамі ў стане вечнага сну («Дзіця, якое спіць» з г.п. Мір Карэліцкага р-на, канец 16 — пач. 17 ст.), з уключэннем у іх атрыбутаў і рэаліст. дэталей (надмагілле ў Нясвіжскім касцёле Божага Цела; пасля 1588). Шляхта, мяшчане, цэхі, брацтвы і інш. шырока карысталіся пячаткамі, пярсцёнкамі-пячаткамі (сігнетамі). Іх вырабам займаліся майстры



*Да арт.* ***Адраджэнне****. Пакланенне вешчуноў. Браслаўскі р-н. 16 ст.*

Віленскага манетнага двара, рамеснікі-злотнікі некаторых бел. гарадоў. Пранікненне рэнесанснай стылістыкі назіралася ў кніжнай графіцы (партрэт Францыска Скарыны ў Пражскай Бібліі, 1517—19), у пашырэнні новых відаў і жанраў гравюры (картаграфія, віды гарадоў, пейзажы, ілюстрацыі), засваенні прыёмаў металаграфікі, паяўленні друкарняў у гарадах Брэст, Нясвіж, Вільня, Слуцк, Заблудаў, дзе працавалі С.Будны, В.Цяпінскі, Л. і С. Зізаніі, П.Мсціславец. Для твораў дэкар.-прыкладнога мастацтва (прадметы свецкага і культавага прызначэння, ювелірныя ўпрыгажэнні, зброя, вырабы з металу, мэбля, шкляны і керамічны посуд, архіт.-дэкар. кераміка, тканіны) характэрна спалучэнне гатычных з паступовай перавагай рэнесансных рыс, стылістыка якіх складалася на працягу 1-й пал. 17 ст. Маст. культура Беларусі ў эпоху А. развівалася пад уплывамі еўрап. з яе ідэямі гуманізму і паступовым адыходам ад сярэдневяковай умоўнасці.

М у з ы к а. У эпоху А. муз. культура Беларусі спазнала кардынальныя змены, характэрныя для ўсёй еўрап. муз.-культ. прасторы: узрасла роля свецкіх форм муз. мастацтва і выканальніцкай практыкі, пашырыліся змястоўнае напаўненне і жанравы спектр музыкі, разгарнуліся харавая поліфанія і інструм. формы, узмацніўся аўтарскі пачатак, укаранілася нотадрукаванне і інш. У станаўленні тагачаснай муз. культуры значную ролю адыгрывалі велікакняжацкія і каралеўскія двары ў Вільні (Жыгімонта Старога, Боны Сфорца, Жыгімонта Аўгуста), Брэсце (М.Радзівіла Чорнага), Гродне (С.Баторыя). Тут ствараліся высокапрафес. капэлы, дзе працавалі мясц. і замежныя выканаўцы і кампазітары: Вацлаў з Шамотул і Ц.Базылік, В.Длугарай і К.Клабан, М.Гамулка і Ф.Мафон, В.Бакфарк і Л.Марэнцыо. Іх творчасць адзначана выкарыстаннем еўрап. жанраў харавой поліфаніі (меса, матэт, шматгалосая песня) і інструм. музыкі (клавірныя, арганныя, лютневыя фантазіі, танц. мініяцюры). У гэтых кампазіцыях увасоб-

*Да арт.* ***Адраджэнне****. Надмагілле. Нясвіжскі касцёл Божага Цела. Пасля 1588.*



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



*Да арт.* ***Адраджэнне****. Маці Божая з дзіцем. Нясвіжскі касцёл Божага Цела. Канец 16 ст.*

лены характэрныя для Рэнесансу эстэтычныя прынцыпы і маст. тэндэнцыі: насычэнне музыкі гуманіст. зместам, акцэнтуацыя свецкай тэматыкі, узмацненне цікавасці да антычных матываў і вобразаў. Рысы еўрап. стылю праяўляліся і ў сродках муз. выразнасці: шырокім выкарыстанні тэхнік шматгалосся, імітацыйных прыёмаў, блізкіх да нідэрландскай і італьян. творчых школ. У муз. жыцці Беларусі павысіўся свецкі кампанент, але асн. цэнтрам фарміравання муз. прафесіяналізму па-ранейшаму заставаўся храм. Асаблівая тагачасная поліканфесійная сітуацыя вызначыла спецыфіку аблічча сакральных форм муз. мастацтва: разам з праваслаўнай традыцыяй харавога спеву (захавалася ў помніках пеўчага мастацтва — ірмалоях) укараняліся каталіцкая, пратэстанцкая і уніяцкая (з канца 16 ст.), а таксама іудзейская і мусульманская канфесійныя плыні. Пры праваслаўных храмах і брацтвах ствараліся харавыя калектывы (Магілёў, Слуцк, Орша, Нясвіж, Супрасль). Пры каталіцкіх касцёлах, уніяцкіх цэрквах і манастырах побач з харамі развівалася арганнае выканальніцтва, муз. адукацыя. У пратэстанцкіх цэрквах друкаваліся першыя нотныя выданні — канцыяналы (Брэст, 1558; Нясвіж, 1563). Муз. культура Беларусі ў эпоху А. развівалася як культура еўрап. тыпу, дапаўнялася разнастайнасцю і багаццем муз.-поліканфесійнай палітры.

*Літ.*: К о н о н В.М. От Ренессанса к классицизму: (становление эстет. мысли Белоруссии в XVI—XVIII вв.). Минск, 1978; Я г о ж. Беларуская мастацкая культура эпохі сярэдневякоўя і Рэнесансу. Мінск, 2006; Л о с е в А.Ф. Эстетика Возрождения. М., 1978; П о д о к ш и н С.А. Проблема восточноевропейского Ренессанса и гуманизма // Иван Федоров и восточнославянское книгопечатание. Минск, 1984; Я г о ж. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мінск, 1990; Я г о ж. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. Мінск, 2003; Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990; Памятники философской мысли Белоруссии первой половины XVIII в. Минск, 1991; Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. Мінск, 1994; Ш м а т а ў В.Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў. Мінск, 2000; Ч а н т у р и я В.А. История архитектуры Белоруссии. 3 изд. Минск, 1985; Ч а н т у р и я Ю.В. Градостроительное наследие Беларуси второй половины XVI — первой половины XIX в.: средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005; Музыка Беларусі эпох сярэдневякоўя і Рэнесанса. Мінск, 2005; Л а з у к а Б.А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1. Мінск, 2007; Д а д з і ё м а в а В.У. Музычная культура Беларусі X—XIX стст. // Беларусы. Мінск, 2008. Т. 2. Музыка.

*В.Р.Языковіч* (агульная частка),
*У.М.Конан* (літаратура),
*С.А.Сергачоў* (архітэктура),
*Б.А.Лазука* (мастацтва),
*В.У.Дадзіёмава* (музыка).

**«АДРАДЖЭ́ННЕ»**, беларускае кааператыўна-выдавецкае таварыства. Існавала ў Мінску з крас. да канца 1922. Засн. па ініцыятыве Акадэмічнага цэнтра Нар. камісарыята асветы БССР з мэтай выдання твораў маст. л-ры і падручнікаў для бел. школ. Выпусціла 13 кніг мастацкай, пед., с.-г., навук. і муз. л-ры, у т.л. першыя паслярэв. зб-кі Я.Купалы «Спадчына», Я.Коласа «Водгулле», З.Бядулі «Пад родным небам», паэ-

*Да арт.* ***Адраджэнне****. Алтар-трыпціх «Святая Кацярына. Маці Божая. Святая Даратэя» з капліцы ў в. Мохавічы Лідскага р-на. Пач. 17 ст.*



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ